ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ “МІНОЙТАЎСКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА”

# Справаздача па выніках выканання задання першага (завочнага) тура I Адкратага рэгіянальнага конкурсу турыстычных праектаў “Я запрашаю Вас на малую радзіму”

Гаўрылюк А.А., IX клас

Кіраўнік даследчай работы:
Мілевіч А.І.

Мінойты, 2018

**ЗМЕСТ**

УВОДЗІНЫ……………………………………………………………..3

ГЛАВА 1. СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ…………………………………5

1.1 Гісторыя вёскі Мінойты…………..……………………5

1.2 Вёска Вялічкі……………………..……………………..6

ГЛАВА 2. КУЛЬТАВЫЯ МЯСЦІНЫ……………………………8

2.1 Царква Святога Елісея Лаўрышэўскага………………………8

2.2 Царква Багародзіца Разумніца ў вёскі Вялічкі……………….9

2.3 Касцёл сэрца госпада Ісуса ……………..………………...10

ГЛАВА 3. ЛЕГЕНДЫ МІНОЙТАЎСКАЙ ЗЯМЛІ ……………………12

3.1 Паходжанне вёскі Мінойты……………………………..12

3.2 Вялічкаўскае возера…………………………………...12

ЗАКЛЮЧЭННЕ………………………..…………………...15

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ……………………..…………17

ДАДАТКІ………………………………………………………18

# УВОДЗІНЫ

Фарміраванне самасвядомасці чалавека, усведамленне ім свайго месца ў сучасным свеце, повязь з папярэднімі пакаленнямі пачынаецца з засваення ведаў пра сваю духоўную спадчыну. Яна ўспрымаецца спачатку на ўзроўні сваёй сям'і, "малой радзімы" і, урэшце, нацыянальнай і сусветнай культуры.

Дадзеная работа ўяўляе сабой даследчы праект, выкананы навучэнцамі IX класа.

Ідэя праекта: аднаўленне і развіццё гісторыка-краязнаўчых ведаў аб гісторыі малой Радзімы.

Навошта ведаць гісторыю мясцовасці, дзе нарадзіўся, вырас, жывеш? Каб беражліва адносіцца да сваіх традыцый, каб лягчэй разумець гісторыю той маленькай часткі сусвету, дзе прайшлі самыя лепшыя гады жыцця – дзяцінства. Праз гісторыю ўзвядзення будынкаў, славутыя біяграфіі жыхароў сутыкнуцца з вехамі гісторыі сваёй малой Радзімы.

Мэта даследвання: вывучэнне гісторыі вёсак Мінойты і Вялічкі.

Для дасягнення мэты былі пастаўлены наступныя задачы:

- фарміраванне грамадзянска-патрыятычных пачуццяў;
- далучэнне да пошукава-даследчай дзейнасці, накіраванай на даследванне мясцін свайго рэгіёна;
- развіццё духоўна-маральных якасцей падрастаючага пакалення;
- выхаванне павагі да гісторыі сваёй малой радзімы; калектывізму, сяброўства.

Аб'ектам вывучэння з'яўляюцца культавыя пабудовы вёсак Мінойты і Вялічкі

Прадмет даследвання ўключае ў сябе гісторыю развіцця культавых пабудоў в. Мінойты і в. Вялічкі.

У аснову даследвання пакладзена наступная гіпотэза: няма ніводнага населенага пункта, які б не меў гісторыі. Гісторыя краіны складаецца з гісторыі малых гарадоў, вёсак, з гісторыі людзей, якія жывуць у іх.

У даследванні прымяняўся комплекс метадаў: крыніцазнаўчы, гісторыка-параўнальны аналіз літаратурных і дакументальных крыніц, матэрыялаў беларускага перыядычнага друку; абагульненне сабранага матэрыялу.

Фарміраванне самасвядомасці чалавека, усведамленне ім свайго месца ў сучасным свеце, повязь з папярэднімі пакаленнямі пачынаецца з засваення ведаў пра сваю духоўную спадчыну. Яна ўспрымаецца спачатку на ўзроўні сваёй сям'і, "малой радзімы" і, урэшце, нацыянальнай і сусветнай культуры.

Даследванне гісторыі сваёй малой Радзімы ўяўляе цікавасць для фарміравання цэласнага навуковага погляду на гісторыю Беларусі, што і абумоўлівае актуальнасць дадзенай тэмы.

# ГЛАВА 1. СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

## 1.1 ГІСТОРЫЯ ВЁСКІ МІНОЙТЫ

Калі род трывалы, у ім заўсёды ёсць сямейныя легенды, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Тое ж і з паселішчам: калі ў яго ёсць легенды, паданні, значыць яно мае сваю гісторыю і будзе мець будучыню праз людзей, якія гэтыя паданні захоўваюць. І яшчэ чалавек засвойвае іх з дзяцінства, а засвоіўшы, як частку свайго светаўспрымання, нязмушана перадае нашчадкам.

**Дванаццаць кіламетраў ад раённага цэнтра г. Ліда знаходзіцца в. Мінойты Траццякоўскага сельскага Савета. Ляжыць яна ў паўночна-заходняй частцы рэспублікі** і мае каардынаты 22º21' усходняй даўгаты і 53º48' паўночнай шыраты. Размясцілася вёска з яе маляўнічымі краявідамі лясоў і балот на Лідскай марэннай раўніне. Сярэднія вышыні не перавышаюць 120 м над узроўнем мора. Раўніна ўтворана адкладаннямі марэны старадаўняга ледавіка Дняпроўскага аледзянення. Верхні покрыў складаюць водналедавіковыя адкладанні і адкладанні антрапагеннага паходжання.

Абсалютная адзнака залягання крышталічнага фундамента складае – 114 м. Іншымі словамі, ён знаходзіцца на глыбіні больш як 200 м. Пераважаючыя атлантычныя паветраныя масы фарміруюць мяккі, даволі вільготны клімат умераных шырот. Лета часта бывае халаднаватае і вільготнае. Сярэдняя тэмпература самага цёплага месяца /ліпеня/ дасягае 17,5 - 18ºС. Зіма мяккая, у апошнія дзесяцігоддзі часцей бясснежная. Устойлівы снежны покрыў наглядаецца рэдка. Самы халодны месяц – люты, з сярэдняй тэмпературай каля -6 -8ºС. Траскучыя лютаўскія маразы даўно сталі прадметам успамінаў старажылаў. Сярэднегадавая колькасць ападкаў вагаецца ад 600 да 650 мм. Выпаральнасць каля 500 мм. Залішняе

ўвільгатненне спрыяе інтэнсіўнаму ўтварэнню забалочаных мясцін. Бліз вёскі працякае, практычна ўжо знікаючая, рака Лідзея. Будучы калісьці шырокай і шматводнай, яна пад уплывам часу, і перш за ўсё антрапагенных фактараў, зараз ператварылася ў ручаёк. Яе прыток Каменка ўвогуле знікла з твару зямлі. *Непадалёку працякае рака Дзітва, куды ўпадае Лідзея. Выток Дзітвы знаходзіцца амаль на мяжы тэрыторыі Літвы і Воранаўскага раёна.* Упадае ў раку Неман. У Лідскім раёне Неман працякае ў сваім сярэднім цячэннем. Пачынаецца ён на поўдні Мінскага ўзвышша са зліцця рэк Лоша, Неманец і Уса. Упадае ў Балтыйскае мора.

У сярэдзіне XVIII стагоддзя пасля смерці Яна Міхала Салагуба, у 1750 годзе двор Мінойты прыкупіў яго старэйшы сын Юзаф Антоній Салагуб – дзяржаўны дзеяч Вялікага Княства Літоўскага, кашталян жэмайцкі і віцебскі, ваявода віцебскі, маршалак Літоўскага Трыбунала, стараста санніцкі.

Да Вялікай Айчыннай вайны ў в. Мінойты жылі памешчыкі Галачэўскія. Маентак іх знаходзіўся, дзе цяпер – Лідскі дом-інтэрнат для псіханеўралагічных хворых. Паколькі ў іх не было дзяцей, яны ўзялі на выхаванне з сям'і Шулейка дзвюх дзяўчынак. Пасля смерці Галачэўскіх сёстры Шулейкі атрымалі ў спадчыну маёнтак.

У гады вайны дзяўчаты кудысьці збеглі. А ў гэты час маёнтак засялілі людзі, якія не мелі сваёй хаты. З прыходам немцаў людзей расстралялі. Лёс распарадзіўся ж так, што доўга пуставаць маёнтку не прыйшлося – тут заснавалі псіхбальніцу. Галоўны урач быў Рубіновіч. Бальніца дзейнічала да канца 1944 года. Калі немцы зноў прыйшлі ў веску, яны ўчынілі расправу з хворымі і ўрачамі бальніцы. Усе былі закапаны ў адной яме, непадалёку ад бальніцы. Пасля вайны прах гэтых людзей быў перанесены на агульныя могілкі.

У час акупацыі ў гэтым маёнтку размясціўся нямецкі гарнізон. Жыхары вескі бясплатна апрацоўвалі зямлю ў гэтым памесці.

Але немцы ім давалі спецыяльны дакумент – (свайсы) – каб іх не вывезлі ў Германію.

У 1945 годзе ў гэтым доме заснавалі туберкулёзны шпіталь.

У 1948 годзе распараджэннем Лідскага райвыканкама быў прысвоены статус – Лідскі дом для псіханеўралагічных хворых.

У 1939 годзе ў вёсцы налічвалася 26 хат. Пасля Вялікай Айчыннай вайны паселішча стала пашырацца. Гэта было звязана, найперш, з пераводам Лідскай РТС у в. Мінойты [4, с. 159].

На сённяшні дзень пражывае 1461 чалавек. Асноўнае насельніцтва складаюць палякі і беларусы, а таксама пражываюць рускія, украінцы, яўрэі, азербайджанцы, татары, малдаване.

## 1.2 ЛЕГЕНДЫ МІНОЙТАЎСКАЙ ЗЯМЛІ

Падчас нашай вандроўкі, можна дакрануцца не толькі да гістарычнага мінулага нашай мясцовасці, але даведаліся пра цікавыя паданні.

Па расказах старажылаў, калісьці ў месцы, дзе цяпер вёска, навокал распасціралася гібкая непраходная багна. Ні ў весну, ні ў восень, як кажуць, ні прайсці ні праехаць. Да гэтага балота падступалі змрочныя, дрымучыя лясы. Непадалёку ад гэтага месца размяшчаліся невялічкія пасяленні. Людзі тут гандлявалі, займаліся рамяством, палявалі, лавілі рыбу. Балота аддзяляла некалькі вёсак ад мястэчка і тракту. Абрыдла кожны раз кладкі насцілаць, і каб лепш і хутчэй было дабірацца з аднаго месца ў другое, над самым багністым месцам быў пабудаваны невялічкі мост. А быў ён такі вузенькі, што пераехаць магла толькі адна павозка або брычка. Усім было добра, хоць і нязручна.

Але вось аднойчы, увечары, пасярэдзіне гэтага маста сустрэліся дзве брычкі пановы, якія вярталіся з палявання. І трэба ж таму здарыцца, абое былі такія ўпартыя, што не захацелі ўступіць дарогу адзін аднаму.

-Мінай ты, - крычыць адзін.

-Мінай ты, - крычыць другі.

Але толку з гэтага было мала. Насупіўшыся, яны рушылі адзін аднаму насустрач. На гэтым спрэчка іх закончылася, таму што цягучая багна забрала іх да сябе. Людзі, якія чулі гэтую спрэчку, разнеслі яе па ўсім свеце.

Прайшоў час, людзі забыліся пра тую бяду, асушылі балота і пачалі сяліцца ў зручным зацішку – на дне былога балота. Час-часам, а легенда зноў усплыла ў памяці людзей.

Вось з таго выпадку быццам бы і знайшлося імя вёсцы – Мінойты [6].

## 1.3 ЦАРКВА СВЯТОГА ЕЛІСЕЯ ЛАЎРЫШЭЎСКАГА

У канцы другога тысячагоддзя адбылося абуджэнне цікавасці да рэлігіі. Да 1995 года ў вёсцы не было праваслаўнага храма і вернікі вымушаны былі наведваць храмы ў Ганчарах, Лідзе, Бярозаўцы.

Першы прыпынак па нашым маршруце – гэта царква ў в. Мінойты.

Царкву Святога Елісея Лаўрышэўскага пачалі будаваць у 1995 г за сродкі вернікаў. Але ў далейшым асноўнымі сродкамі збудавання з’яўляўся ДП “Мінойтаўскі рамонтны завод”. Адміністрацыя завода пайшла насустрач просьбе айца Іана. Дапамога аказвалася як фінансавая, так і матэрыяльная. Дзякуючы сумеснай працы вернікаў і работнікаў завода, у 1997 годзе царква адчыніла дзверы для ўсіх веруючых.

Аздабленнем унутранага інтэр’еру займаліся рэзчыкі па дрэве: Рудзевіч Аляксандр, Марушка Віталій, Фёдараў Андрэй.

Зараз службы праводзіць іерэй Валерый Траян.

У час экскурсіі можна даведацца пра Прэпадобнага Елісея Лаўрышэўскага.

Прэпадобны Елісей Лаўрышаўскі нарадзіўся ў сям'і літоўскага князя Траняты, які, па ўсёй бачнасці, быў паганцам. Дзіцячыя і юнацкія гады святога праходзілі ў сям'і багатых і ўплывовых бацькоў. Елісей атрымаў добрую адукацыю, якая дазваляла яму знаходзіцца ў вышэйшых кругах тагачаснага грамадства. Дасягнуўшы паўналецця, Елісей паступіў на службу пры двары вялікага князя Міндоўга.

Зносіны з выдатнымі людзьмі таго часу прывяло юнага Елісея да знаёмства са святіцелем Лаўрэнціем Тураўскім, які пасля стаў яго духоўным бацькам і настаўнікам. Прыняўшы святое хрышчэнне, Елісей пакінуў двор і адышоў ў 1225 г. у пустыню, дзе ў далейшым на ўласныя сродкі заснаваў манастыр - Лаўру. У XIII стагоддзі манастыр, заснаваны прэпадобным Елісеем, быў духоўным і культурным цэнтрам Вялікага Княства Літоўскага. Каля 1329 года для Лаўрышэўскага манастыра было напісана пергаментнае рукапіснае Евангелле - помнік беларускага кнігапісання. Яно захавалася да нашага часу і цяпер знаходзіцца ў г.Кракаве.

На жаль, пра жыццё, працу і подзвігі прэпадобнага Елісея да нашага часу звестак не захавалася, магчыма, з-за вялікай колькасці войнаў, якія праходзілі ў гэтых мясцінах. Аднак вядома, што 23 кастрычніка 1250 года ён быў забіты апантаным паслушнікам.

Падчас адной з войнаў XVI ст. мошчы святога былі схаваныя ў зямлю, а пасля пажару ў манастыры знайсці іх так і не ўдалося. Каля 500 гадоў мошчы прэпадобнага Елісея знаходзяцца ў зямлі на месцы старажытнага манастыра. І па сённяшні дзень сілай малітваў святога суцяшаецца ўсякі наведвальнік гэтага святога месца.

Шмат што змянілася з тых часоў, аднак нязменным застаецца тое, што зямля беларуская мае вялікага малітоўніка і заступніка перад Богам - прэпадобнага Елісея Лаўрышэўскага. З 1984 года прэпадобны Елісей

праслаўляецца ў Саборы Беларускіх святых. Вось у гонар гэтага прэпадобнага святога і асвячоны храм у нашай вёсцы.

У царкве сам сабою складваецца ўнутраны зварот да Бога, з душы вырываецца свая малітва. Хочацца прасіць у Неба даравання, заступніцтва, абароны. Хочацца стаць моцным і пакаяцца ў грахах.

## 1.4 КАСЦЁЛ СЭРЦА ГОСПАДА ІСУСА

Па дарозе ў в. Вялічкі нельга не прыпыніцца каля яшчэ аднаго хрысціянскага храма.

Касцёл у вёсцы Мінойты быў заснаваны ў 1929 г. Будавалі яго памешчыкі Галачэўскія і самі прыхаджане. Першы ксёндз – Пралат Карал Любянец. Разам з ім адпраўляў службу капонік Маўскі. Некаторы час працаваў імісіянер Эмельзман (немец).

У 1936 г – ксёндз Чэслаў Янкоўскі, у 1947 г яго пасадзілі ў турму. Касцёл у гэты час быў закрыты. З турмы Часлаў Янкоўскі выйшаў у 1995 г і зноў вярнуўся да сваёй дзейнасці ў касцёле. Памёр і пахаваны на Мінойтаўскіх могілках.

На сённяшні дзень адпраўляе службу ў касцёле Старыла Андрэй. Пры касцёле дзейнічае школа рэлегійнай навукі.

## 1.5 ВЁСКА ВЯЛІЧКІ

У непасрэднай блізасці ад Мінойтаў знаходзіцца вёска Вялічкі, якая мае больш старажытныя карані і таму ўплывала на развіццё новага пакалення.

Вёска Вялічкі знаходзіцца за 11 кіламетраў на паўднёвы ўсход ад г. Ліда. З XVI - XVII ст вядомая дзякуючы таму, што прыблізна ў сярэдзіне XVI ст тут нарадзіўся друкар і кнігавыдавец Ян Карцар.

Ніякіх дакументальных звестак паходджання Карцана, аб яго дзіцячых і юнацкіх гадах на жаль не вядома. Але на сваіх першых віленскіх выданнях ён указваў “Друковано в Вильне у Яна Карцана с Величии”, “Вильна. В Литве у Иоанна Велиценсема”, “Вильна. Напечатано... Иоанном Велицен”. Гісторыкі кнігадрукавання выказалі меркаванне, што Ян Карцан мог быць родам з вёскі Вялічкі, Лідскага раёна.

Ян Карцан – своеасаблівы Альд Мануцый у Літве. Як і Альд, Карцан выступаў на ніве кнігадрукавання як адукаваны прадпрымальнік. Ён улічваў попыт на літаратуру і выдаваў найбольш хадавыя кнігі, у значнай ступені гуманістычнага накірунку.

Друкарскай справе навучаўся ў Кракаве. У 1574 г.быў запрошаны на працу ў Лоск у Замкавую друкарню, дзе працаваў да 1580 г. У Лоску Карцан набыў немалы вопыт у кнігадрукарскіх справах. З цягам часу яго, чалавека дзейснага і ўмелага, перастае задавальняць залежнае становішча ў Замкавай тыпаграфіі. Ён усё часцей марыць аб арганізацыі сваёй асабістай друкарні, аб самастойнай працы. У Карцана ў агульных рысах быў намечаны і “выдавецкі план”. Ён змог накапіць сродкі, неабходныя для набыцця дома, дзе можна было б усталяваць друкарню, а таксама для пакупкі друкарскай маёмасці. Каб здзейсніць свае мары, Карцан некалькі разоў наведваўся ў Вільню, дзе вырашыў працягнуць выдавецка-друкарскую дзейнасць.

У канцы 1579 г. Карцан канчаткова развітваецца з Замкавай тыпаграфіяй у Лоску і перабіраецца ў Вільню. 31 ліпеня 1599 г. ён уступіў у законнае валоданне домам на вуліцы Бернардынскай, які адкупіў у віленскага мяшчаніна Захарыяша Амуратовіча. З гэтага часу пачынаецца новы, самы працяглы і плённы перыяд кнігавыдавецкай дзейнасці Карцана. Больш за трыдцаць гадоў актыўна дзейнічала яго друкарня ў Вільні. Выданні Карцана адрозніваліся высокай культурай.

На пачатку XX ст вёска Ганчарскай воласці Лідскага павета налічвала 132 жыхары са 184 дзесяцінамі зямлі.

Пасля таго, як адгрымела Першая сусветная вайна, па ўмовах Рыжскага мірнага дагавору, на карысць Польшчы адышла значная частка тэрыторыі Беларусі. З 1921 г. па 1939 г. Вялічкі вёска Ганчарскай гміны Лідскага павета Навагрудскага ваяводства, у якой налічвалася 28 жылых пабудоў са 156 жыхарамі [4, с. 142].

У 16 гадзін 18 верасня 1939 г. Чырвоная Армія прайшла праз Мінойты і Вялічкі сваім вызваленчым паходам у бок Ліды. Так скончылася польская акупацыя для жыхароў Заходняй Беларусі [4, с. 158].

У канцы Вялікай Айчыннай вайны ў вёсцы была пабудавана сямігадовая школа, якая праіснавала 37 гадоў.

У сярэдзіне 90-х гадоў у Вялічках пражывала 120 жыхароў на 56 падвор'ях. Быў магазін. А на пачатку XXI ст колькасць двароў паменшылася да 46 адзінак. Шмат жыхароў пакінула свае двары па тых ці іншых прычынах.

На жаль, большасць з нас пра месца, дзе нарадзіўся і рос, мала чаго могуць сказаць, а што ўяўляла гэта мясцовасць гадоў сто назад – тым больш.

## 1.6 ЦАРКВА БАГАРОДЗІЦА РАЗУМНІЦА Ў ВЁСЦЫ ВЯЛІЧКІ

Асцярожна ідзём па вуліцы, як па слядах далёкай гісторыі. Баімся іх затаптаць, сцерці. І крыўдна, што ўсё тут цяпер абыдзена, ціха.

…Адгрымела вайна і востра паўстала пытанне навучання падрастаючага пакалення. У той час бліжэйшая ад Мінойтаў школа знаходзілася ў в. Ганчары і дабірацца туды было вельмі складана. Таму было вырашана адкрыць школу ў в. Вялічкі. У 80-я гады школа ў Вялічках працавала ў дзве змены і не адпавядала ўмовам навучання і выхавання.

У школу прыязджаў міністр адукацыі. Ён убачыў тую цеснату, тыя нязручнасці. У школе не было спартыўнай залы. М.Р. Мінкевіч зайшоў у

школу падчас перапынку, калі прыйшлі вучні другой змены. Паліто і сумкі дзяцей ляжалі на падлозе, бо не было дзе распрануцца. Убачыўшы гэта, Міхаіл Гаўрылавіч дазволіў пазапланава пабудаваць сярэднюю школу ў в. Мінойты. Мінойтаўская сярэдняя школа прыняла сваіх першых вучняў 1 верасня 1981 года.

Будынак перадалі Мінойтаўскаму РЗ. Гэта была база адпачынку для рабочых завода.

У сакавіку 2008 г будынак старой школы перадалі Навагрудскай праваслаўнай Епархіі. Доўгі час там жылі дзве манахіні: матушка Вольга і матушка Любоў, яны пісалі праваслаўныя іконы. У кожнай - свая біяграфія, свой шлях да Бога. Іх аб’ядноўвала вера, духоўнасць. Сваімі малітвамі, сваёй верай і працай вучылі людзей жыць сябе па Божых запаветах.У гэтым будынку праходзілі царкоўныя службы.

Зараз будынак з’яўляецца рэзідэнцыяй епіскапа Лідскага і Смаргонскага Парфірыя. Пазней мы даведаліся, што ў гэтым будынку будзе храм іконы Багародзіцы “Разумніца”. У хуткім часе адбудзецца ўзвядзенне купалоў. Кожны чацвер тут праводзяцца богаслужэнні.

Многа гадоў у гэтым будынку даваліся веды вучням, а зараз гэта цэнтр духоўнага адраджэння.

Такім чынам, рэлігійная традыцыя і рэлігійны вопыт не губляюць свайго ранейшага значэння і займаюць значнае месца ў жыцці сучаснага беларускага грамадства.

## 1.7 ЛЕГЕНДА ПРА ВЯЛІЧКАЎСКАЕ ВОЗЕРА

Цікавай мясцінай, якая мае сваю легенду, з’яўляецца Вялічкаўскае возера – любімае месца адпачынку жыхароў Мінойтаў і навакольных вёсак.

Даўным-даўно ля дарогі ( цяпер шаша Ліда-Навагрудак) стаяла вялікая вёска Вялічка. Людзі жылі ў ёй багата. Толькі на канцы вёскі ад дарогі жыла бедная ўдава з маленькімі дзецьмі.

Аднойчы ў вёску прыйшоў жабрак, стары сівы дзядок. Ён абхадзіў усе двары, але яму ніхто нават скарынкі ў торбу не кінуў. Зайшоў дзед і да ўдавы. Ужо вечарэла. І дзядок папрасіўся нанач. Жанчына ласкава запрасіла старога сесці і дала павячэраць нішчымнай заціркі. На гэтую зацірку яна зварыла апошнюю жменю жытняй мукі. Жабрак застаўся начаваць.

Назаўтра жанчына ўстала і здзівілася: у хаце і ў каморы было многа хлеба і ўсяго другога. А дзед ёй сказаў:

- Выйдзі, кабета, з хаты з дзецьмі і ідзі не аглядаючыся, хоць што небудзь і пачуеш. Як аглянешся, то на месцы тваёй хаты вырасце груша.

Жанчына так і зрабіла. Толькі яна адышла за вёску, як пачула ззаду трэск, шум і енк людзей. Усё крышылася і ламалася. Вёска прапала, а на яе месцы ўтварылася возера, а замест хаты ўдавы на беразе возера стаяла груша. Жанчына павярнулася, хацела пайсці паглядзець, што здарылася, але ж адразуператварылася ў камень.

На другі дзень людзі з суседніх вёсак бачылі, як з возера выплывалі аконныя рамы, дзверы і іншыя хатнія рэчы. Людзі пачалі збіваць жэрдкі, каб змераць глыбіню вады, а з вады чалавечы голас сказаў:

- Не мерай тычыною, бо памераеш галавою.

Усё ж такі, самыя цікаўныя ўзялі доўгую вяроўку, прывязалі камень і апусцілі на дно. Дна не дасталі, а з вады пачуўся зноў голас:

- Не мерай вяроўкаю, бо памераеш галоўкаю.

Але адзін чалавек пры гэтым утапіўся, і яго як не шукалі, не змаглі знайсці, хоць возера было невялікае.

Цяпер на беразе Вялічкаўскага возера расце старая груша і ляжыць вялікі камень з адбіткам быццам бы жаночае рукі.

# ГЛАВА 2.

# ГЛАВА 3.

Наша вёска мае выгаднае ЭГС, так як знаходзіцца бліз горада Ліда. Праз вёску праходзіць шасейная дарога Ліда – Навагрудак, Ліда – Слонім. Не далёка праходзіць аўтамагістраль Гродна – Мінск. Ёсць і чыгуначная станцыя, бо каля вёскі праходзіць чыгуначная дарога Ліда – Баранавічы, пры дапамозе якіх ёсць сувязь з іншымі тэрыторыямі.

Так чыгуначная дарога праходзіла цераз Мінойты ўжо ў 1900 г., але прыпынку не было. Адносілася да Баранавічскай чыгуначнай дарогі. Спачатку вузлавой станцыяй з'яўляўся прыпынак Ганчары. Але не далёка каля в. Мінойты было месца знаходжання баласту, які выкарыстоўвалі для пуцявой насыпі. У выніку гэтага з'явілася неабходнасць узнікнення чыгуначнага вузла. І ў 1948 годзе была заснавана станцыя Мінойты, па якой рухаліся цягнікі ў двух напрамках. Першапачаткова налічвалася 2 каляі, рэльсы трымаліся на драўляных шпалах, была жэзлавая блакіроўка (сімафорная).

Затым з'явілася трэцяя каляя, і ў выніку – паўаўтаматычная блакіроўка.

Першым начальнікам станцыі быў Курыла, затым Калюк, Батура, Шашкоўскі, Кашко, Лебедзь. На гэты момант Аблажэй С.Э. Неаднаразова калектыў станцыі займаў прызавыя месцы сярод прагляду на лепшую чыгуначную станцыю.

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Працуючы над праектам, у дзяцей была магчымасць займацца не толькі самастойна, але і ў групе, пры гэтым яны маглі максімальна выкарыстоўваць свае магчымасці.

Дадзены праект – гэта дзейнасць, якая дазволіла дзецям праявіць сябе, паспрабаваць свае сілы, прыкласці свае веды, прынесці карысць і паказаць публічна свой дасягнуты вынік.

Можна адзначыць станоўчыя моманты працы над праектам.

1. Выхаванне пачуцця патрыятызму, павагі да людзей якія жывуць побач.

2. Выхаванне навыкаў самастойнасці, адказнасці.

3. Выпрацоўка ўменняў працаваць з літаратурай, выбудоўваць дыялог з аднакласнікамі, з аднагодкамі, з навучэнцамі пачатковай школы, з дарослымі.

4. Пашырэнне кругагляду.

5. Давядзенне пачатай справы да канца!

Апрабацыя вынікаў даследвання адбывалася на паседжаннях педагагічнага савета і савета музея Мінойтаўскай сярэдняй школы у працэсе арганізацыі і правядення круглых сталоў, прысвечаных пытанням далучэння навучэнцаў да даследчай дзейнасці. Па выніках даследвання быў складзены турыстычны маршрут аднаго дня, які выкарысталі ў пазашкольных мерапрыемствах пачатковыя класы.

Сабраныя намі звесткі, спадзяёмся, будуць тым зыходным матэрыялам, які дапаможа ў адраджэнні гісторыі вёскі Мінойты.

Як гаючая, чыстая вада наталяе бадзёрасцю любога вандраўніка. Такой жа духоўнай крыніцай была і ёсць зямля беларуская.

Не ведаем, ці верыце вы, а мы верым, што ў чалавека ёсь душа. І гэту душу, як мабільнік, трэба пастаянна падзараджаць.Толькі не электрычнай энергіяй , а духоўнай. Дзе ўзяць гэты таямнічы зарад?

Нам здаецца, што нашу духоўнасць мацуюць вера і надзея, дабрыня і спагада, міласэрнасць і дабрачыннасць. Усяму гэтаму вучаць нас бацькі і настаўнікі, кнігі і прырода. А яшчэ - царква, якая аб'ядноўвае ў сябе розныя рэлігіі.

Прайдзіце нашым шляхам, не пашкадуеце!

# СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1.Верашчагіна А.У. Хрысціянскія святы на Беларусі / А.У.Котаў. – Мінск: Беларусая навука, 2005. – 247 с.

2.Кулажанка Л.Я. Праваслаўныя святыні на Беларусі / Л.Я.Кулажанка. – Мінск: Беларуская навука, 2005. – 242 с.

3.Ліпскі У. Вясёлка над Нёманам / У.Ліпскі. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2011. – 279 с.

4. Памяць: Ліда. Лідскі р-н: Гіст.-дак. Хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / Рэдкал.: В.Г. Баранаў і інш.; Маст. Э.Э. Жакевіч. – Мн.: Беларусь, 2004. – 566 с.: іл.

5. http//www. bel–jurist. com

6. http//www. pawet. Net